нологий, элитам удается достаточно эффективно манипулировать психологией масс. Часть массовых устремлений ориентируется на неолиберальные идеалы. Эта часть представлена прежде всего молодежью, надеющейся на включение в неолиберальные элитарные круги, а также недавно имевшей высокий социальный статус интеллигенцией, страдающей от утраты привилегий. Внутри самих элит также есть противоречия, связанные как со статусом в мировой иерархии, так и с ориентациями на столкнувшиеся в непримиримом противоборстве две основные мировоззренческие линии: традиционализм и либерализм радикальной направленности. В существующие линии напряжения особую остроту привносит геополитическая повестка дня, которая приобрела в конечном счете характер противостояния цивилизаций: доминирующей западной с китайской, исламской, российской. Вероятно, очередной виток противоречий между элитами и массами выразит себя в мобилизации элит в направлении усиления манипуляций массами, тем более что в тактике геополитической борьбы уже несколько десятилетий просматриваются попытки обыгрывании противоречий в традиционалистских пространствах (религиозных, этнических). Таким образом, одна из основных тенденций в отношениях современных элит и масс и внутри этих групп – мировоззренческий разлом между приверженцами неолиберализма и традиционализма.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Лэш, К. Восстание элит и предательство демократии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gtmarket.ru/library/basis/5424/5426. – Дата доступа 26.01.2021.

УДК 357. 23 (091) “1902” (476.6)

# КОННЫЯ ЗАВОДЫ Ў ГАРАДЗЕНСКІМ ПАВЕЦЕ ПА СТАНУ НА 1902 ГОД

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Яшчэ на пачатку 1860-х гадоў становішча конегадоўлі ў Гарадзенскай губерні лічылася незадавальняючым. У знакамітым апісанні губерні П. Баброўскага нават адзначалася, што «Толькі нямногія абшарнікі маюць свае заводы. Нават уплыў конных заводаў на паляпшэнне ўласцівасцей тутэйшых коней незаўважны» [1]. Тым не менш, конныя заводы ў той час у губерні былі, а некаторыя нават



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

лічыліся лепшымі: Валіцкага ў Азёрах, Талубеева ў Гліннай і Ячыноўскага ў Вярховіцах [1]. Па некаторых звестках, у 1882 г. у губерні было 10 прыватных конных заводаў [2]. Так як коні з'яўляліся на той час важнейшым эканамічным і вайсковым рэсурсам, то тагачасная расейская дзяржава была зацікаўлена ў наяўнасці дакладнай інфармацыі пра колькасць і якасць працы конных заводаў. Дзеля гэтага ажыццяўляліся розныя мерапрыемствы, адно з якіх мела месца на пачатку XX ст.

23 чэрвеня 1902 года ў Гарадзенскую губернатарскую канцылярыю праз Галоўнага кіраўніка дзяржаўным конезаводствам быў даведзены імператарскі загад аб неабходнасці ажыццявіць збор інфармацыі пра конегадоўлю ў губерні. Дакумент утрымліваў неабходныя тлумачэнні: «патрэбу ў выданні такога спіса маюць не толькі асобы, якія жадаюць набыць коней для розных мэтаў, але і самі конезаводчыкі, якія зрэдку не ведаюць, куды трэба звярнуцца за папаўненнем і асвяжэннем уласнага заводскага складу» [3, арк. 1].

Збор дадзеных належала ажыццяўляць у адпаведнасці з пэўным парадкам, які быў вызначаны ў спецыяльнай анкеце «Звесткі пра конны завод». Акрамя агульнай інфармацыі (назва губерні, імя і прозвішча заводчыка, яго званне, месца размяшчэння і паштовы адрас завода), у анкету ўваходзіла дзевяць пунктаў: 1. Лічба завадскіх жарабцоў; 2. Лічба завадскіх матак; 3 Сярэдняя колькасць галоў прыплоду (у год); 4. Сорт разводзімых коней; 5. Парода вытворнікаў (заводскіх жарабцоў і матак); 6. Куды паступае прыплод; 7. Год заснавання завода; 8. Сведчанне аб вызваленні прадпрыемства ад абавязковай пастаўкі ў войска; 9. Выкарыстанне жарабцоў на грамадскія патрэбы [3, арк. 2-2 адв.].

Анкету належала запаўняць не адвольна, але згодна з падрабязнай інструкцыяй «Тлумачэнне да апытальнага лістка» [3, арк. 3-3 адв.]. Так, паводле чацвёртага пункта сорт коней патрабавалася пазначаць выключна па наступных раздзелах: англійска-скакавы, рысіста-прызавы, верхавы ці спецыяльна-рамонтны, запражны (гарадскі ці карэтна рысісты, паўрысісты ці спецыяльны шлейны) і рабочы. Даволі шырокім быў пералік парод, выбар якіх складаўся амаль з двух дзясяткаў варыянтаў. Між іншымі прапаноўваліся і такія: біцюгская, ардэнская, першаронская, клайдзесдальская, суфальская, фінская.

У гэтым жа «Тлумачэнні» было дакладна вызначана, што конным заводам лічылася прадпрыемства, «на якім утрымліваюць не менш пяці матак для вываду і гадавання коней палепшаных парод і гатункаў, пры чым выкарыстанне матак для працы, несумненна, не з'яўляецца галоўнай мэтай завода» [3, арк. 3 адв.].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

За правядзенне мерапрыемства персанальна адказвалі кіраўнікі паліцыі ў паветах губерні, так званыя спраўнікі. Цыркулярны ліст «губернскім спраўнікам» аб неабходнасці пачаць збор на паветах быў высланы з канцылярыі 27 чэрвеня 1902 г. за подпісам Пятра Сталыпіна, выконваючага абавязкі губернатара, які прасіў не зацягваць справы [3, арк. 5-5 адв.].

Ужо ў пачатку жніўня 1902 г. уся неабходная і дапоўненая інфармацыя па Гарадзенскім павеце была сабрана. У губернскую канцылярыю быў перададзены спіс конезаводчыкаў і вынікі анкетавання.

Табліца 1 – Алфавітны спіс конных заводаў у Гарадзенскім павеце

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Біспінг Іван Восіпавіч | м. Масаляны |
| Вайчынскі Вальдэмар Антонавіч | м. Длугопаль |
| Карыбут-Дашкевіч Зміцер Рышардавіч | м. Вайцехоўшчызна |
| О-Брыен дэ Ласі Маўрыкі Патрыкеевіч, палкоўнік і дваранін | м. Кругляны, паштовая станцыя Індура |
| Святаполк-Чацвярцінскі Станіслаў Канстанцінавіч, камергер імператарскага двара | м. Скідзель |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк.12.*

Табліца 2 – Анкетныя дадзеныя пра конныя заводы ў Гарадзенскім павеце

| Завод | Пункты анкеты | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| Біспінга | 3 | 8 | | верхавыя | паўкроўныя англійскія | | | 1877, № 576 | |
| Вайчын-скага | 1 | 10 | 5 | верхавыя | арабскія | | | згублена | |
| Карыбут-Дашкевіча | 2 | 40 | 35 | верхавыя | чыстакроўныя і паўкроўныя англійскія, змешаныя | | | 1899, № 120 | |
| О-Брыена | 3 | 14 | ад 8 да 12 | верхавыя, запражныя | чыстакроўныя англійскія, англа-арабскія, арабскія, ардэнскія, жмудзкія і мясцовыя | ул. патрэбы | 1874 | 1877, № 318 | |
| Святаполк-Чацвярцінскага | 3 | 21 | 5 | верхавыя, запражныя і рабочыя | ардэнскія, мясцовыя, жмудзкія (?) ці паўкроўныя англійскія (?) | ул. патрэбы | 1880 | - | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 14-20 адв.*

Асобна 6 жніўня 1902 г. гарадзенскі спраўнік паведаміў, што «у маёнтку Жыдомля, які належаў генеральшы Дзяконскай, але арандуецца Анджэеўскім, коннага завода няма» [3, арк. 11]. Аднак анкета на завод у Жыдомлі была заведзена і запоўнена па наступных пунктах: п. 1 – 2; п. 2 – 6; п. 4. – верхавы; п. 5. – паўкроўна-англійская [3, арк. 13-13 адв.].

Такім чынам, на 1902 г. з больш чым трох дзясяткаў конных заводаў Гарадзенскай губерні ў ваколіцах Гародні дзейнічала пяць. Адно прадпрыемства, якое належала Маўрыкію О-Брыену дэ Ласі існавала больш чвэрці стагоддзя. Памеры прадпрыемстваў былі невялікімі, а найбольшым з іх з’яўляўся завод Зміцера Карыбут-Дашкевіча. Гарадзенскія конезаводчыкі спецыялізаваліся на вытворчасці пераважна верхавых коней, а базавай пародай была англійская, хаця не грэбавалі і так званай мясцовай.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. / Сост. П. Бобровский. – Ч. 2. – СПб., 1863. – 1077 с.
2. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 1. Культура сацыяльнай эліты XIV-пачатку XX ст. – Мінск, 2013. – 575 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773.

УДК 357. 23 (091) “1902” (476.6)

# ЗВЕСТКІ ПРА КОННЫЯ ЗАВОДЫ Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ НА 1902 ГОД

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Летам 1902 г. у Гродзенскай губерні быў праведзены перапіс сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія патраплялі пад крытэрыі так званага коннага завода. Выкананне мерапрыемства ўскладалася губернскімі ўладамі на паліцыю, што гарантавала адносную дакладнасць звестак, якія належала збіраць па схеме, прапанаванай у адмыслова складзенай анкеце. Адпаведныя рапарты аб выкананні загаду павінны былі падрыхтаваць павятовыя спраўнікі [3, арк. 1-5 адв.].

Відаць, першым (у другой палове ліпеня 1902 г.) выканаў пастаўленую задачу не гарадзенскі спраўнік, які канчатковую



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ